**А. Гурда**

# АДЛЮСТРАВАННЕ ЭМОЦЫЙ СРОДКАМІ НЕВЕРБАЛЬНАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ФРАЗЕАЛОГІІ

Мова – гэта не толькі сродак, з дапамогай якога людзі наладжваюць сувязь, абменьваюцца інфармацыяй, але і своеасаблівае люстэрка жыцця і працы народа, яго грамадскага і культурнага развіцця. Кожная нацыянальная культура мае такі моўны матэрыял, які дазваляе ёй перадаць гістарычны вопыт свайго народа, асаблівасці яго мыслення і псіхікі, маральна-этычныя і эстэтычныя нормы наступным пакаленням.

У даследаванні прыводзіцца пералік базавых эмоцый – пэўны набор асноўных чалавечых эмоцый, сапраўдных у адносінах да любой культуры. Падаецца класіфікацыя фразеалагізмаў беларускай мовы ў адпаведнасці з адлюстраваннем універсальных эмоцый.

Задавальненне, радасць: *выскаляць зубы, зубы грэць на сонцы, на ўсе застаўкі смяяцца, на ўсе трыццаць два зубы, прадаваць зубы, скаліць зубы, сушыць зубы, на ўвесь рот смяяцца, у кулак смяяцца, у рукаў смяяцца, надрываць жывот ад смеху, качацца ад смеху, паехаць ад смеху.*

Сум, гора, адчай: *брацца за галаву, развешваць губы, вешаць (апускаць, спускаць) нос, вешаць нос на квінту, пускаць слязу, разводзіць сырасць, распускаць нюні, выціскаць слязу, глытаць слёзы, бярозаю ліцца, ліць слёзы, аблівацца слязамі, галасіць немым голасам, ваўком выць, не сваім голасам крычаць, ламаць сабе рукі, рваць на сабе валасы.*

Цікавасць, ажыятаж: *не адрываць вачэй, браць свае вочы ў жменю, глядзець (пазіраць) на ўсе вочы, глядзець у рот, вока гарыць.*

Незадаволенасць, гнеў, злосць: *бліскаць вачыма, ставіць калом вочы, капыліць губу, паказваць кіпцюры, даводзіць (нешта) з пенай на вуснах, скрыгатаць зубамі, паказваць зубы, налівацца крывёю, павышаць голас, лезці на сцяну.*

Пагарда, грэбаванне: *глядзець зверху ўніз, адварочваць морду (рыла), вярнуць рыла, шастом (крукам) галавы не дастаць, капыліць нос, круціць носам, адварочваць нос, вярнуць нос, драць нос, крукам (кіем, аршынам, сажнем) носа не дастаць, фігай (кукішам) носа не дастанеш, з задраным носам, праз (скрозь) зубы размаўляць, крывіць губы.*

Здзіўленне, спалох: *паціскаць плячыма, разводзіць рукамі, хапацца за галаву, разяўляць рот, адкрываць рот, азірацца на кусты, лыпаць вачыма.*

Сорам: *не ведаць, куды свае рукі падзець; згараць ад сораму; не ведаць, куды вочы падзець; недзе вочы падзець; свяціць вачыма.*

Страх, жах: *валасы становяцца дыбам, лыпаць вачамі, вочы на лоб лезуць, каленкі (лыткі) дрыжаць, прадаваць дрыжыкі, дрыжыкі бяруць.*

Даследаванне феномена эмоцый у моўнай карціне свету беларусаў на матэрыяле фразеалагізмаў сведчыць пра тое, што разгледжаны фактычны матэрыял дапамае не толькі вызначыць спектр эмоцый, уласцівых характару беларусаў, але і адлюстроўвае традыцыйнае мысленне, паказвае асаблівасці светаўспрымання нашых продкаў.